роду малюнак свету, які рэпрэзентуецца адрасантам і адрасатам у рамках данага дыскурсу. Даная сфера камунікатыўнай прасторы можа быць вызначана для любога тыпу камунікацыі і для любога тыпу дыскурсу: ад прыватнай гутаркі да сацыяльна значымых тыпаў дыскурсу.

Уяўленне адрасанта (гаворачага) пра камунікатыўную прастору ў рамках канкрэтных зносінаў вызначае выбар камунікантам тыпу маўленчых паводзінаў, які з'яўляецца свайго роду інструментам фарміравання камунікатыўнай прасторы.

У лінгвапрагматыцы маўленчыя паводзіны «разумеюцца як сукупнасць канвенцыяльных (ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з правіламі) і неканвенцыяльных (ажыццяўляюцца па ўласным гледжанні) маўленчых учынкаў, якія ажыццяўляюцца індывідам ці групай індывідаў» [3, с. 15].

Адрасант (гаворачы) арыентуецца на адну з трох установак: 1) ажыццявіць пранікненне ў камунікатыўную прастору адрасата, дэфармаваць яго ў адпаведнасці з уласным малюнкам свету, уяўленнямі, ацэнкамі і г. д.; 2) эксплiцыраваць уласныя ўяўленні і ацэнкі, не імкнучыся пры гэтым істотна змяніць уяўленні і ацэнкі адрасата; 3) стварыць агульную з адрасатам якасна новую для сябе і для яго камунікатыўную прастору.

Такім чынам, паняцце *камунікатыўная прастора* арганічна ўключаецца ў сістэму такіх ключавых паняццяў і катэгорый лінгвістыкі, як адрасант, адрасат, маўленчыя паводзіны, камунікатыўны намер.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Шарков, Ф. И. Основы теории коммуникации / Ф. И. Шарков. – М. : Соц. отношения, 2005. – 342 с.

2. Почепцов, Г. Г. Теория коммуникации / Г. Г. Почепцов. – М., 2001. – 311 с.

3. Клюев, Е. В. Речевая коммуникация : учеб. пособие / Е. В. Клюев. – М., 2002. – 242 с.

**М.Р. Гарбачык, Д.А. Гарошка**
Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ ДЗЕЯСЛОВА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

У навуковай граматыцы дзеяслоў вызначаецца як знамянальная часціна мовы, якае абазначае дзеянне або стан як працэс і выражае яго з дапамогай граматычных катэгорый асобы, часу, ладу, трывання, стану,

ліку, а ў прошлым часе – роду. Паняцце працэсу мае абагульненае значэнне. Пад працэсам маюцца на ўвазе разнастайныя з'явы: дзеянні (пісаць, будаваць, скакаць), перамяшчэнне ў прасторы (ляцець, бегчы, ісці), фізічны стан (ляжаць, сядзець), маўленчую дзейнасць (гаварыць, прамаўляць, думаць і інш.), успрыманне (бачыць, чуць, успрымаць), эмацыйны стан (любіць, радавацца, сумаваць) і інш. У сувязі з гэтым неабходна сістэматычнае і мэтанакіраванае практычнае азнаямленне вучняў з разнастайнасцю семантыкі данай часціны мовы. На думку Т.Р. Рамзаевай, пачынаючы з 1 класа неабходна вучыць вучняў звяртаць увагу на лексічнае значэнне дзеясловаў. У працэсе назіранняў за іх семантыкай адбываецца назапашванне таго канкрэтнага матэрыялу, на аснове якога становіцца магчыма абагульненне адносна тыповага для дзеяслова лексіка-граматычнага значэння – абазначэнне дзеяння прадмета.

У параўнанні з іншымі часцінамі мовы для дзеяслова ўласцівы разнастайныя граматычныя катэгорыі і формы. У пачатковых класах вывучаюцца толькі некаторыя граматычныя катэгорыі, уласцівыя данай часціне мовы. У адпаведнасці з праграмай малодшыя школьнікі атрымліваюць веды пра катэгорыі ліку, часу, роду (у прошлым часе), асобы, пра спражэння і неазначальную форму дзеяслова. Т.Р. Рамзаева лічыць, што пры адборы тэарэтычнага матэрыялу неабходна ўлічваць ступень яго неабходнасці для ўсвядомленага рашэння маўленчых і арфаграфічных задач.

Задачы вывучэння дзеяслова ў пачатковых класах:

1) фарміраванне паняцця пра дзеяслоў як часціну мовы (лексічнае значэнне дзеяслова, змяненне дзеяслова па ліках, часах, неазначальная форма дзеяслова, спражэнне);

2) развіццё ўмення распазнаваць дзеясловы сярод іншых часцін мовы;

3) фарміраванне ўменняў змяняць дзеясловы па ліках і часах, адрозніваць адну часавую форму ад іншай, утвараць часавыя формы дзеяслова, распазнаваць дзеясловы I і II спражэння;

4) выпрацоўка навыку правапісу часціцы *не* з дзеясловамі, навыку правапісу асабовых канчаткаў дзеясловаў;

5) узбагачэнне слоўніка вучняў новымі дзеясловамі, развіццё навыку дакладнага і ўсвядомленага ўжывання дзеяслова ў вусных і пісьмовых выказваннях;

6) развіццё лагічнага мыслення вучняў (авалоданне аперацыямі аналізу, параўнання слоў, абагульнення і інш.).

У працэсе азнаямлення са змяненнем дзеясловаў па ліках праводзіцца назіранне за яго семантыкай і фармальна-граматычным сродкам выражэння катэгорыі ліку. У якасці моўнага матэрыялу выкарыстоўваюцца два сказы, у якіх ужываецца адзін і той жа дзеяслоў у розных формах ліку.

Для падбору моўнага матэрыялу вучням прапануюцца два сюжэтныя малюнкі. На першым малюнку намалявана дзеянне аднаго прадмета, а на другім – дзеянне некалькіх прадметаў. У працэсе маўлення вучні вызначаюць, колькі прадметаў намалявана на кожным малюнку, і складаюць па іх сказы. Напрыклад: *Самалёт ляціць. Самалёты ляцяць*.

Аналіз моўнага матэрыялу ажыццяўляецца ў наступнай паслядоўнасці: 1) чытанне 1-га сказа (*Самалёт ляціць*); 2) вылучэнне дзеяслова (*ляціць*); 3) вызначэнне семантыкі дзеяслова (дзеяслоў *ляціць* абазначае дзеянне аднаго прадмета); 4) пастаноўка пытання да дзеяслова (што робіць?).

Далей робіцца абагульненне і ўводзіцца тэрмін *дзеяслоў адзіночнага ліку*. Аналагічна адбываецца знаёмства вучняў з дзеясловамі множнага ліку. Пасля гэтага праводзіцца назіранне за фармальна-граматычным сродкам выражэння колькасці, якое дазваляе вучням прыйсці да высновы, што пры змяненні дзеясловаў па ліках змяняецца канчатак. На думку Т.Р. Рамзаевай, такім чынам дасягаецца ўсведамленне малодшымі школьнікамі сувязі паміж пытаннем, на якое адказвае дзеяслоў, формай ліку, у якой ён ужываецца, і канчаткам.

Пры азнаямленні са змяненнем дзеяслова па часах неабходна ўлічваць сутнасць данай катэгорыі – адносіны дзеяння да моманту гутаркі. Задача настаўніка – дапамагчы дзецям усвядоміць змест тэрміна *момант гутаркі*. Для гэтага мэтазгодна правесці з вучнямі гутарку:

– Што мы выкарыстоўваем для таго, каб мець зносіны адзін з адным? (Гаворка.) Наша размова адбываецца цяпер, г. зн. у даны момант. Тое, што мы гаворым цяпер, – гэта ёсць наша маўленне ў даны момант, гэта і ёсць момант гутаркі.

– Калі мы маем зносіны, мы здзяйсняем розныя дзеянні. Што вы робіце зараз? (Сядзім, адказваем на пытанні, пішам.)

– Дзеянне можа адбывацца ў пэўны момант гутаркі. Сёння на ўроку мы вызначым, як дзеянне, якое абазначае дзеяслоў, адносіцца да моманту гутаркі, і даведаемся пра дзеяслоў штосьці новае. Пасля гэтага вучням прапануецца скласці тры сказы, у якіх адзін і той жа дзеяслоў прадстаўлены ў розных часавых формах: цяперашнім, прошлым, будучым часе. Сказы складаюцца на аснове жыццёвага вопыту малодшых школьнікаў, іх назіранняў. Напрыклад: *Сёння свеціць сонца. Учора свяціла сонца. Заўтра будзе свяціць сонца*.

Аналіз моўнага матэрыялу праводзіцца ў наступнай паслядоўнасці: 1) чытанне першага сказа (*Сёння свеціць сонца*); 2) вылучэнне дзеяслова (*свеціць*); 3) вызначэнне семантыкі дзеяслова (дзеяслоў *свеціць* абазначае дзеянне); 4) вызначыць, калі адбываецца дзеянне, якое абазначае дзеяслоў, па адносінах да моманту гутаркі (дзеянне, якое абазначае дзеяслоў *свеціць*,

адбываецца цяпер, у момант гутаркі); 5) пастаноўка пытання да дзеяслова (што робіць?).

Далей робіцца абагульненне і ўводзіцца тэрмін *дзеяслоў цяперашняга часу*. Аналагічна адбываецца знаёмства з дзеясловамі прошлага і будучага часу.

Пры вызначэнні часу дзеяслова для малодшых школьнікаў асноўным паказчыкам выступае пытанне, на якое адказвае дзеяслоў. Важна навучыць вучняў карыстацца пытаннем з мэтай распазнання і ўтварэння часавых формаў дзеяслова. Сутнасць катэгорыі часу ў дзеясловах становіцца для вучняў больш зразумелай пры параўнанні аднаго і таго ж дзеяслова ў розных часавых формах. У сувязі з гэтым рэкамендуецца ў працэсе вывучэння тэмы «Дзеяслоў» сістэматычна праводзіць практыкаванні, якія прадугледжваюць змяненне дзеясловаў па часах.